## ЗА АКНОМ ГАМОНІЦЬ РАННЕ ГАЛАСІСТЫМ ШЧАБЯТАННЕМ *(Ніна Галіноўская)*



— Васілінка, паглядзі, каго я знайшоў, — паклікаў Лянок дзяўчынку.

— Ой, маленечкае якое, бездапаможнае зусім, — заклапочана сказала Васілінка. — Трэба абавязкова пакласці яго ў гняздо! Бедныя птушачкі. Яны так крычаць.

— Шкада гэтага маленькага шпачаняці, але я не ведаю, ці прымуць яго бацькі пасля нашых рук, — засумняваўся Лянок.

Як быць у такой сітуацыі?

Завіха́ліся — старанна працавалі.
Зага́д — *рус.*: приказ.
Само́тна — сумна.

Прачытайце і адгадайце загадку.

Ледзь вясна ў нас наступае —
Ён канцэрты пачынае.
Гучна льецца песня-свіст...
Як завецца той артыст?

*Ніна Парукаў.*

капш

Прачытайце назву твора. Разгледзьце малюнкі. Падумайце, пра што гэты твор.

## Шпачынае гняздо

*Міхась Пазнякоў*

За домам, у якім жыве Вадзік, раскінуўся прыгожы стары парк. Праўда, аб тым, што ён стары, нагадваюць толькі чатыры таўшчэзныя ліпы. У маі ўсе дрэвы ў парку апрануліся ў зялёныя абновы, а гэтыя векавыя ліпы самотна пакалыхваюць сухім голлем. У дупле адной з іх пасялілася шпачыная сям'я. І Вадзік любіць гуляць тут, слухаць птушыныя песні.



Аднаго разу, вяртаючыся са школы, Вадзік пачуў, што ў парку працуе бензапіла. «Зразаюць ліпы!» — апякла раптоўная здагадка. І ён кінуўся да любімай мясцінкі.

Так і ёсць. Адна ліпа, напалову струхлелая ўсярэдзіне, ужо ляжала на траве. Двое рабочых завіхаліся каля другой. За ёю стаяла ліпа са шпачыным гняздом.

— Дзядзечкі! — закрычаў Вадзік і паказаў на дрэва.— Вунь тую ліпу нельга спілоўваць. Там, у дупле, жывуць шпакі.

— Няўжо? — здзівіўся старэйшы рабочы. — А нам загад: спілаваць усе чатыры. Заўтра прыедзе трактар карчаваць пні.



— Жывуць! Жывуць! — захваляваўся Вадзік. — Я ведаю. Шпачыха яйкі выседжвае, а шпак ёй вусеняў носіць.

— Тады вось што, — сказаў рабочы, — бяжы ў дырэкцыю парку. А мы пакуль не будзем чапаць тваю ліпу.

Дырэктар парку выслухаў Вадзіка, пахваліў:

— Малайчына! Дрэва пакінем, пакуль шпакі ў дупле. А як адляцяць у вырай, спілуем. Стары́я вельмі ліпы. Баімся, каб самі не паваліліся ў буру. Наробяць тады бяды…

1. Чаму ліпы трэба было спілаваць?
2. Як Вадзік выратаваў шпачынае гняздо?
3. Як паставіліся да хлопчыка дарослыя? Раскажыце.
4. Падзяліце твор на чатыры часткі. Прыдумайце ім загалоўкі. Перакажыце твор у групах.



Як вы думаеце, чым птушкі прываблiваюць людзей? Дзе павінны жыць птушкі, якія нарадзіліся на волі?

На паце́ху — для забавы.
Крану́лі — узрушылі.

Паслухайце верш і скажыце, ці добрыя гэтыя дзеці.

## Добрыя дзеці

*Алесь Гарун*

Паставілі дзеці сіло. Вераб’я
Хацелі злавіць на пацеху,
Злавілі сініцу, крычаць: — Вой-я-я!
А радасці колькі, а смеху!
Імча́цца да маці: — Сінічка, глядзі!
— А дзе ж вы ўзялі́? — Злавілі,
Дастань ты ёй клетку, хутчэй пасадзі.
— Нядобра вы, дзеткі, зрабілі!
— Мы будзем яе і паіць і карміць,
Спява́ла б нам птушка прыгожа.
— Ах, дзеткі! У няволі яна замаўчыць,
Спяваць у няволі не можа…
Успомніце толькі, як нудна сядзець,
Як з хаты мароз не пушчае.
То ж дзень, вам здаецца, як тыдзень ідзець,
Хоць я і ўсяк разважа́ю.



А птушку вы хочаце з хаткі яе
Ўзяць, пасадзіць у чужую…
Не му́чце, пусціце, рыбулькі мае,
На волю яе залатую.
І ма́тчыны словы ў сэрцах дзяцей
Ласка́выя струны кранулі,
І добрыя дзеці — пры́клад для людзей! —
Сініцы свабоду вярнулі.

1. Навошта дзеці хацелі злавіць вераб'я?
2. Чаму маці не парадавалася?
3. Прачытайце размову маці з дзецьмі па ролях. Чаму дзеці вярнулі сініцы свабоду? Як бы паступілі вы?
4. Растлумачце, чаму аўтар назваў верш «Добрыя дзеці».